1. Як называліся дзяржавы, што ўтварыліся ў 1919 і 1922 гадах?
2. Якая прадукцыя выраблялася на прамысловых прадпрыемствах рэспублікі ў 1920—1930-я гады?
3. Што змянілася ў жыцці сялян?
4. Якія мовы былі дзяржаўнымі ў Беларусі ў 1920—1930-я гады?
5. Якая гістарычная падзея адбылася ў 1939 годзе?
6. Што дапамагала людзям розных нацыянальнасцяў будаваць новае жыццё?
7. Чаму мы адзначаем Свята працы?

1. Прадукцыяй якіх прадпрыемстваў вы карыстаецеся ў час вучобы ў школе?
2. Назавіце фабрыкі, кандытарскія вырабы якіх вам падабаюцца.

## 25—26. БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Самыя жорсткія выпрабаванні выпалі на долю беларускага народа ў час Вялікай Айчыннай вайны. Вайна з нямецка-фашысцкімі захопнікамі доўжылася амаль 4 гады — з **1941** па **1945 год**. Яна пачалася 22 чэрвеня 1941 года раніцай, калі людзі яшчэ спалі. На мірных

 Правообладатель Издательский центр БГУ

жыхароў Беларусі раптоўна абрынуліся тысячы снарадаў і бомбаў.

**Абаронцы Радзімы.** Першы ўдар ворага прынялі пагранічнікі і воіны Брэсцкай крэпасці. 28 дзён геаічна трымаліся яе абаронцы. Ужо ўзяты быў Мінск, варожыя танкі дасягнулі Смаленска. А ў глыбокім тыле ворага працягвалі змагацца пагранічнікі.



Пеця Кацельнікаў

Дапамагалі абаронцам крэпасці падлеткі. Сярод іх быў 12-гадовы **Пеця Кацельнікаў** — выхаванец музыканцкага ўзвода. Пеця прабіраўся ў паўразбураныя склады, шукаў і здабываў гранаты і патроны, прадукты. Дапамагаў параненым. Пад смяротным абстрэлам прыносіў ваду, так неабходную ў чэрвеньскую спякоту. Здабыць хоць крыху вады было подзвігам.

Усе цяжкасці і страх не скарылі абаронцаў. Сіл і рашучасці дадавалі любоў да Радзімы і згуртаванасць. На сцяне крэпасці да нашага часу захаваўся надпіс, пакінуты яе абаронцамі: «Паміраю, але не здаюся. Бывай, Радзіма!»

Подзвіг абаронцаў Брэсцкай крэпасці стаў прыкладам мужнасці і адвагі, вернасці воінскаму абавязку. Абаронцы ішлі на подзвіг, не думаючы пра славу. Бо яны змагаліся за Радзіму. І так было на ўсіх франтах на працягу ўсёй вайны.

Правообладатель Издательский центр БГУ



Помнік «Кацюша» ў Оршы

Подзвігі здзяйсняліся ў бітвах пад Масквой і Сталінградам, пад Курскам і на берагах Дняпра.

У абарончых баях пад Оршай упершыню былі выкарыстаны рэактыўныя мінамёты. Гэта зброя атрымала сярод салдат ласкавую назву «Кацюша». Так байцы любоўна звалі па імені сваіх маці, жонак, сясцёр, каханых.

Разгледзьце карту «Беларусь у час Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гадоў», змешчаную на с. 16—17 атласа. Пакажыце на ёй помнік «Кацюша» і горад, дзе ён знаходзіцца.

У час Курскай бітвы беларускі лётчык **Аляксандр Гаравец** у адным з паветраных баёў здзейсніў подзвіг. Ён збіў 9 варожых самалётаў, але загінуў і сам. Яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

 Правообладатель Издательский центр БГУ



Аляксандр Гаравец



Дзед Талаш

На тэрыторыі Беларусі, захопленай ворагамі, разгарнулася сапраўдная народная вайна. У ёй удзельнічалі і дарослыя, і дзеці, і старыя. Аказваў дапамогу партызанам амаль 100-гадовы **Дзед Талаш (Васіль Талаш)**.

У складзе партызанскага атрада гераічна змагаўся з ворагам 14-гадовы **Марат Казей**. Апынуўшыся ў акружэнні, юны партызан адстрэльваўся да апошняга патрона. А потым гранатай падарваў сябе. Пасмяротна Марату прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Разгледзьце карту «Беларусь у час Вялікай Айчыннай вайны», змешчаную на с. 16—17 атласа. Пакажыце на ёй помнік Марату Казею і горад, дзе гэты помнік устаноўлены.

Самаахвярна вёў барацьбу партызанскі камандзір **Бацька Мінай**. Так партызаны празвалі

Правообладатель Издательский центр БГУ



Мінай Шмыроў
(Бацька Мінай)



Канстанцін
Заслонаў

**Міная Шмырова**. Ворагі захапілі ў якасці заложнікаў чатырох яго дзяцей і патрабавалі ад яго здачы ў палон. Старэйшая дачка, 14-гадовая Ліза, здолела тайна з турэмнага засценка перадаць запіску. Яна прасіла бацьку не здавацца і адпомсціць за дзяцей — трохгадовую Машу, сямігадовую Зіну і дзесяцігадовага Сяргея.

На чыгуначнай станцыі Орша патрыёты пад кіраўніцтвам **Канстанціна Заслонава** наладзілі выраб мін. Яны выглядалі як кавалкі вугалю, што выкарыстоўваўся ў якасці паліва для паравозаў. А трапіўшы ў топку паравоза, узрываліся. Беларускія партызаны разгарнулі так званую рэйкавую вайну. Яны пускалі пад адхон варожыя цягнікі, узрывалі рэйкі і чыгуначныя масты. У выніку фашысты панеслі вялікія страты. Канстанціну Заслонаву было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

**Трывожныя званы.** На карце Беларусі вы не знойдзеце сёння назваў многіх даваенных вёсак. У час вайны яны былі спалены захопнікамі

 Правообладатель Издательский центр БГУ



Абеліск у выглядзе коміна на месцы адной са спаленых хат Хатыні

разам з жыхарамі. Так здарылася і з вёскай Хатынь у Лагойскім раёне. Захопнікі сагналі ўсіх жыхароў у хлеў, зачынілі дзверы і падпалілі. Крывавым полымем гарэлі людзі. Палалі і іх хаты. Загінулі 149 чалавек — дарослыя і дзеці.

Сёння на месцы Хатыні — помнік. Там, дзе былі хаты, свечкамі стаяць коміны. А ўверсе на іх — званы. Трывожна нагадваюць яны людзям аб жудаснай трагедыі 186 беларускіх вёсак. Гэтыя вёскі так і не аднавіліся пасля вайны. Не засталося жыхароў, якія маглі б паставіць новыя хаты, пасадзіць сады, вырасціць і навучыць дзяцей. Каля трох мільёнаў жыхароў Беларусі загінула ў час Вялікай Айчыннай вайны.

Правообладатель Издательский центр БГУ 



Мемарыяльны комплекс «Дзецям — ахвярам вайны» ў пасёлку Чырвоны Бераг

Ахвярамі вайны станавіліся і дзеці. Іх трагічнаму лёсу прысвечаны мемарыяльны комплекс у пасёлку Чырвоны Бераг, што на Гомельшчыне. Тут у гады вайны быў створаны зборны пункт для гвалтоўна адабраных у маці дзяцей. Ім было ад 8 да 14 гадоў. У цэнтры стаіць бронзавая статуя дзяўчынкі з ускінутымі над галавой рукамі. Побач з ёю «мёртвы клас» з пустымі белымі бетоннымі партамі і школьнай дошкай. На гэтых партах сучасныя дзеці пакідаюць кветкі і цукеркі.

**Вызваленне.** Летам 1944 года войскі Чырвонай Арміі пачалі канчатковае выгнанне ворага з Беларусі. Дапамагалі салдатам партызаны. На адзін з лясных аэрадромаў яны

 Правообладатель Издательский центр БГУ



Лётчык Аляксандр Мамкін

даставілі выратаваных дзяцей з Полацкага дзіцячага дома.

Лётчык **Аляксандр Мамкін** на сваім самалёце перавозіў дзяцей на «вялікую зямлю». Так называлі тэрыторыю, свабодную ад захопнікаў. Пры падлёце да лініі фронту самалёт быў падбіты і загарэўся. Полымя ахапіла кабіну. На лётчыку загарэліся камбінезон і шлемафон. Лётныя акуляры ўплавіліся ў твар. У лётчыка быў парашут, і ён меў магчымасць выкарыстаць яго для ўласнага выратавання. Але за яго спінай былі дзеці. Пілот пасадзіў самалёт. І паспеў задаць сваё апошняе ў жыцці пытанне: «Дзеці жывыя?»

Правообладатель Издательский центр БГУ 

Імкліва рушылі савецкія войскі да Мінска. Тут знаходзіліся вялікія сілы ворага. Яны былі акружаны і знішчаны або ўзяты ў палон. 3 ліпеня 1944 года савецкія войскі вызвалілі беларускую сталіцу ад ворага. Пасля вайны пад Мінскам быў пабудаваны Курган Славы. Ён сімвалізуе подзвіг і мужнасць савецкіх воінаў. Мы святкуем **3 ліпеня** як дзяржаўнае свята — **Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі).**



Мемарыяльная дошка ў памяць
аб Трыфану Лук’яновічу

 Правообладатель Издательский центр БГУ

У далёкім Берліне, за тысячы кіламетраў ад роднай зямлі, здзейсніў подзвіг воін-беларус **Трыфан Лук’яновіч**. У нейкі момант жорсткага бою нечакана стала ціха. Раптам у цішыні пачуўся дзіцячы плач. Гэта была нямецкая дзяўчынка, маці якой загінула ў час бою. Наш зямляк папоўз да дзіцяці, забраў яго і паўзком накіраваўся да сваіх. Як толькі ён перадаў дзяўчынку сваім сябрам — грымнуў стрэл. Варожая куля смяротна параніла адважнага воіна. У гонар подзвігу нашага земляка ў адным з паркаў Берліна пабудаваны велічны помнік.

Любоў да Бацькаўшчыны, чалавечая годнасць, нянавісць да захопнікаў заклікалі беларусаў ісці ў бой. Заклікалі змагацца супраць тых, хто жадаў ператварыць нашу краіну ў лагер смерці за калючым дротам. **9 мая 1945 года** скончылася Вялікая Айчынная вайна. Таму гэты дзень мы святкуем як **Дзень Перамогі**.

1. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна?
2. Аб чым сведчыць надпіс на сцяне Брэсцкай крэпасці: «Паміраю, але не здаюся. Бывай, Радзіма!»?
3. Чым вас усхвалявала гісторыя пра Бацьку Міная?
4. Раскажыце пра трагедыю жыхароў беларускай вёскі Хатынь. Аб чым нагадваюць сёння званы?

Правообладатель Издательский центр БГУ

5. Чаму лётчык Аляксандр Мамкін не скарыстаўся парашутам, калі яго самалёт загарэўся?
6. Раскажыце пра подзвіг Трыфана Лук’яновіча.
7. Патлумачце, чаму вайну 1941—1945 гадоў называюць Вялікай Айчыннай.
8. Калі і чаму беларусы адзначаюць Дзень Перамогі?
9. Раскажыце, як у вашай сям’і святкуюць гэты дзень.

Калі ўшанаваць хвілінай маўчання памяць кожнага жыхара Беларусі, што загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны, колькі гадоў мы б маўчалі? Падлічыце.

1. Даведайцеся пра ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, якія з’яўляюцца вашымі землякамі.
2. Наведайце музей або выстаўку, прысвечаную падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Апішыце адну з ваенных падзей у вашай мясцовасці.

Правообладатель Издательский центр БГУ